УДК 902/904

# КРАМЯНЁВЫ ІНВЕНТАР МЕЗАЛІТЫЧНАГА ЧАСУ З ПОМНІКА ГРОДНА-16.

***Святлана Шувалава***
*Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, г. Гродна, Беларусь*
shuv66666@gmail.com

Анатацыя: Археалагічны помнік Гродна-16 быў адкрыты падчас шурфоўкі ў 2020 г. Помнік размяшчаецца на нізкай тэрасе правага берага р. Нёман. Быў праведзены аналіз крэмніевага інвентару, які можа быць звязаны з мезалітам. Па матэрыялам можна сказаць аб наяўнасці чалавека на дадзенай тэрыторыі ў познім мезаліце.
***Ключавыя словы: мезаліт, крэмень, прылады працы, Гродна.***

# FLINT INVENTORY OF THE MESOLITHIC PERIOD FROM THE SITE OF HRODNA-16.

***Shuvalova Svetlana***
*Yanka Kupala State University of Hrodna, Hrodna, Belarus*

Summary: The archaeological site Hrodna-16 was discovered during mining in 2020. The site is located on a low terrace on the right bank of the river Neman. An analysis of flint inventory, which may be related to the Mesolithic, was carried out. According to the materials, it can be said that there was a person in this area in the late Mesolithic.
***Key words: Mesolithic, flint, objects of labor, Hrodna***.

**Уводзіны.** Помнік Гродна-16 быў адкрыты ў 2020 г. У гэтым жаў годзе старшым выкладчыкам кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін А.Д.Гаршкоў былі закладзены 2 шурфа, дзе былі зафіксаваныя культурныя парэшткі ад позняга мезаліту да сярэднявечча [1, с. 20-22, 23]. У 2021 г. А.Д.Гаршкоў ў паўночнай часткі помніка заклаў шурф 3, памерам 2 кв.м, але ў ім нічога не было зафіксавана. [2, с. 14]. У 2022 г. даследаванні працягнула ведучы навуковы супрацоўнік Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музею, кандыдат гістарычных навук А.Ф.Касюк. Пад час археалагічных даследаванняў на роўнай пляцоўцы помніка быў закладзены раскоп 1 і траншэя 1. У выніку была атрымана калекцыя артэфактаў, якая складаецца з 463 адзінак (211 – раскоп 1; 253 – траншэя 1). З гэтай калекцыі намі было вылучана 14 артэфактаў, якія адносяцца да мезалітычнага часу.

Задачай дадзенага артыкула з'яўляецца ўвядзенне ў навуковы зварот часткі калекцыі позднемезалітычных крамянёвых матэрыялаў з помніка Гродна-16.







**Мал. 1. Карта месцаразмяшчэння помніка Гродна-16.[1, с.186]**

**Мал. 2. Крамянёвыя артэфакты атрыманыя ў выніку археалагічных даследаванняў помніка Гродна-16. 1- фрагмент прылады нявызначанай, 2- Мікраразец.**

**Асноўная частка**. Помнік Гродна-16 размешчаны на тэрыторыі турбазы Мелавыя горы, на нізкай тэрасе правага берага р. Нёман (каардынаты: 53°43'2.18 «Пн. ш. 23°46’21.29» Усх. д.) [1, с. 20]. Тэхніка-марфалагічная характарыстыка мезалітычных артэфактаў прадстаўлена ў табліцы №1. Намі былі выдзелены чатыры катэгорыі: тэхналагічныя сколы, прадукты дэбітажу, фармальныя прылады і адыходы вытворчасці.

***Тэхналагічныя сколы.*** У траншэі быў знойдзены скол падпраўкі пляцоўкі нуклеуса. Мае памеры: даўжыня 2,6 см, шырыня 1,45 см, таўшчыня 1,1 см.

***Прадукты дэбітажу***. Было знойдзена 3 экзэмпляра адшчэпаў і іх фрагмента ў раскопе, адзін з іх мае скарынку. Маюць памеры: даўжыня ад 2,1 см да 2,5 см, шырыня ад 0,9 см да 1,3 см, таўшчыня ад 0,3 см да 0,4 см.

Было знойдзена 2 экзэмпляра пласціны ў траншэі: адыстальная пласціна, праксімальная частка пласціны. Было знойздена 3 экзэмпляра пласціны і іх фрагмент у раскопе: апраксімальная рабрыстая пласціна, фрагмент дыстальнай часткі пласціны падскарыністы, медыяльная частка пласціны з тэрмічным уздзеяннем. Маюць памеры: даўжыня ад 1,1 см да 3,1 см, шырыня ад 0,8 см да 2,2 см, таўшчыня ад 0,2 см да 0,4 см.

***Фармальныя прылады і адыходы вытворчасці***. Адшчэп са скошаным рэтушшу канцом, які быў знойздены ў раскопе. Мае памеры: даўжыня 2,1 см, шырыня 1,2 см, таўшчыня 0,3 см.

Медыяльная частка пласціны з рэтушшу малочна-блакітнага колеру, якая была знойдзена ў трнашэі. Мае памеры: даўжыня 2,7 см, шырыня 2,2 см, таўшчыня 0,3 см.

Мікраразец, які быў знойдзены ў траншэі. Мае памеры: даўжыня 1,7 см, шырыня 1,5 см, таўшчыня 0,5 см.

Укладыш(?) на якім ёсць сляды рэтушы, быў знойдзены ў раскопе. Мае памеры даўжыня 1,3 см, шырыня 1,5 см, таўшчыня 0,4 см.Фрагмент прылады нявызначанай, які быў знойдзены ў раскопе. Мае памеры: даўжыня 1,2 см, шырыня 0,9 см, таўшчыня 0,3 см.

***Сыравіна.*** У асноўным крамянёвыя матэрыялы ў калекцыі зроблены з крэйдавага крэменю светла-шэрага або цёмна-шэрага колеру, празрыстыя на прасвет, на некаторых маюцца сляды паціны. 6 артэфактаў пакрыты слабай малочна-блакітнай пацінай. 3 артэфакта маюць паціну. 1 артэфакт мае тэрмічнае ўздзеянне.

**Высновы.** Такім чынам на аснове аналізу калекцыі позднемезалітычных матэрыялаў, атрыманых падчас археалагічных даследаванняў на помніку Гродна-16, мы можам зрабіць выснову аб засяленні абследаванай мясцовасці ў познім мезаліце. Гэта пацвярджаецца, перш за ўсё, наяўнасцю ў калекцыі мікраразца і скола падпраўкі пляцоўкі нуклеуса. У перспектыве – далейшае даследавання гэтага помніка і навакольных тэрыторый з мэтай пошуку помнікаў мезалітычнага перыяду.

**Табліца 1. Тэхніка-марфалагічная характарыстыка знаходак с помніка Гродна-16.**

| Марфалагічная група | Катэгорыя | Колькасць (траншэя) | Колькасць (раскоп) | Усяго ў групе |
|---|---|---|---|---|
| III | Скол падпраўкі нуклеуса | 1 | - | 1 |
| IV | Адшчэпы і іх фрагмент | - | 3 | 8 |
| | Пласціны і іх фрагмент | 2 | 3 | |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| V | Адшчэп з рэтушшу | - | 1 | 5 |
| | Пласціна з рэтушшу | 1 | - | |
| | Мікраразец | 1 | | |
| | Укладыш(?) | - | 1 | |
| | Фрагмент прылады нявызначанай | - | 1 | |
| | | | Разам: | 14 |

III - тэхналагічныя сколы; IV – прадукты дэбітажу; V – фармальныя прылады і адыходы вытворчасці.


1. Гаршкоў, А.Д. Справаздача аб археалагічных даследваннях на тэрыторыі Ваўкавыскага і Гродзенскага раёнаў вобласці ў 2020 годзе / Фонда археалагічнай навуковай дакументацыі Цэнтральнага навуковага архіва НАН Беларусі.
2. Гаршкоў, А.Д. Справаздача аб археалагічных даследваннях на тэрыторыі Ваўкавыскага і Гродзенскага раёнаў вобласці ў 2021 годзе / Фонда археалагічнай навуковай дакументацыі Цэнтральнага навуковага архіва НАН Беларусі.